**Маціеўскі, М.** Яму і сёння дзевятнаццаць / М. Маціеўскі // Чырвоны прамень (Чашніцкі раён). — 1989. — 1 ліп. — С. 2–3.

## ЯМУ І СЁННЯ ДЗЕВЯТНАЦЦАЦЬ

Гляджу на здымак і не магу паверыць. Зусім яшчэ хлапчук. Вочы па-дзіцячаму даверлівыя, шчырыя. І душа ж у яго была такая – шчырая, адкрытая і вельмі ранімая. Была?! Не, ён і сёння між нас, у нашай памяці. Ніколі не забудуць дзевятнаццацігадовага Юрыя Кузняцова ні яго родныя, блізкія, ні яго равеснікі-сябры, ні настаўнікі. Не ў праве забыць яго і кожны з нас.

У дзевятнаццаць гадоу загінуў на афганскай зямлі воін-інтэрнацыяналіст, кавалер ордэна Чырвонай Зоркі Юрый Кузняцоў. Сумленны, сціплы, старанны і адважны.

**– Юрый рос без бацькі, – скрозь слёзы ўспамінае маці Тамара Цімафееўна. – Яму так хацелася стаць дарослым і дапамагаць мне ва ўсім. Шмат працаваў на агародзе, самая цяжкая работа была на ім. Ён не дазваляў капаць ні мне, ні бабулі, якую таксама вельмі любіў, як і яна яго. Усю бульбачку перавязе дадому на веласіпедзе. Крывіначка мая.**

Слёзы туманяць вочы, голас Тамары Цімафееўны зрываецца. Доўгі час маўчым, толькі гадзіннік мерна адлічвае мінуты.

– З маленства любіў рабіць мне падарункі. Намалюе і падорыць. А вочы такія шчаслівыя, аж ззяюць. У школе сэканоміць на сняданках і абавязкова купіць нам да свята што-небудзь.

**З першай стыпендыі ў вучылішчы падарыў мне духі за 25 рублёў. Кажу яму: «Ты ж сабе крыху пакінь». А ён мне: «Ты лепш распарадзішся за мяне...»**

Няўдобна распытваць маці, якая ў мірны час пахавала свайго сына. Але трэба. Мы ўсе павінны ведаць, якім быў герой-афганец.

**– Ён любіў людзей, любіў жыццё, хацеў мець сям'ю, дзяцей. Вельмі крыўдзіўся на мяне, што няма ў яго брата. Можа, сэрца прадчувала, што застануся адна?**

У армію хацеў вельмі пайсці, спортам займаўся.

Не, не маглі больш трываць ні яна, ні я. Невыносны боль распаленым металам апякаў сэрца, моцны ціск стукаў у скроні...

Настаўніца СШ № 2 горада Новалукомля Яўгенія Аляксееўна Ермачэнка з усёй сілай хоча быць стрыманай, але дрыжачыя ноткі ў голасе выдаюць хваляванне:

– Добры, вельмі добры хлопчык быў. Свой 4-ы клас, у якім вучыўся Юра, я ўбачыла ўпершыню ў верасні 1974 года. Прыйшла на ўрок рускай мовы, дзе мяне сустрэлі 44 пары ўважлівых, дапытлівых, цікаўных вачэй. Абвяла клас позіркам і міжволі спынілася на невялікіх, але такіх жывых і чыстых вачах, бадай, самага маленькага ў класе хлопчыка. Апрануты вельмі акуратна.

**Юра Кузняцоў быў старанным, уважлівым на ўроках. Не любіў гучных слоў. На перапынках жывы, рухавы, непаседлівы. Але за ўсе сем гадоў вучобы ў маім класе я ніколі не бачыла, каб Юра пакрыўдзіў дзяўчынку, ці пабіўся з хлопчыкам. Сэрца ў яго было добрае.**

Некалькі хвілін маўчым. Яўгенія Аляксееўна ўглядаецца ў твар Юры на фотаздымку, па-мацярынску пяшчотна гладзіць яго. Яна ганарыцца сваім выхаванцам:

**– Ва ўсіх мерапрыемствах Юра прымаў самы актыўны ўдзел. То ён партызан у інсцэніроўцы песні «Ой, бярозы ды сосны», то барабаншчык, то ўдзельнік працоўнага дэсанту, то незаменны мой памочнік у паходзе па роднаму краю.**

У 9-м класе да нас прыйшлі Ігар Данілавіч і Генадзь Ясны. Хутка яны сталі лепшымі сябрамі Юрыя Кузняцова і Толі Франтавікова (яны сябравалі даўно). Так і засталіся гэтыя хлопцы неразлучнымі, але ўжо без Юры. А ён жа быў агульным любімчыкам.

Ніколі не забуду, як Юра любіу слухаць расказы пра вайну. І ўсё прымаў блізка да сэрца, любіў, вядома, як і яго аднагодкі, гуляць у «партызан» і «разведчыкаў». І наўрад ці думаў, што неўзабаве на самай справе пойдзе ў кровапралітны бой.

Вераснёўскім днём 1982 года Юрыя Кузняцова праводзілі ў армію. А дзень быў надзвычай цёплы, сонечны. Здаецца, нічога не прадказвала бяду.

Вось што пісаў родным гвардыі рэдавы кулямётчык Юрый Кузняцоў.

**«Служба мая ідзе добра. Вось нядаўна ездзілі ў зялёную зону. Крыху адпачнулі. Наеўся да адвалу персікаў, абрыкосаў, яблыкаў, аж страўнік прыхапіла. Аб калючкі крыху расцарапаў руку, забінтаваная, таму і почырк дрэнны.**

**Цалую. Беражыце сябе. Юра. 7.06.83 г».**

А тады ж ён быў паранены ў жорсткім баі з душманамі.

**«Добры дзень, дарагія мама і бабуля!**

**Ну што вы так хвалюецеся? Я сапраўды жывы і здаровы. Кормяць нас выдатна. І за чэкі, якія нам замест грошай выдаюць, можна што хочаш купіць. Націскаю на пячэнне. Хутка таўсцяком стану.**

**Жадаю здароўя. Не хвалюйцеся. Я ж салдат!..»**

А яму часта прыходзілася сядзець у засадах, выследжваць праклятых душманаў Якое там лячэнне, там нават вады не хапала. Лізалі падэшвы камянёў, каб хоць крыху наталіць смагу. Хто не быў там, цяжка зразумець усё гэта. Шмат пакут вынеслі хлопцы, але не задрыжэлі ў іх калені, мужна вынеслі ўсе выпрабаванні.

З вайсковай характарыстыкі гвардыі радавога Юрыя Кузняцова.

**«Ю. Кузняцова любілі таварышы. Ён быў чулы, уважлівы, смелы, вынослівы. Заўсёды прыходзіў на выручку. У баях мужны, адважны, знаходлівы. Сапраўдны воін-інтэрнацыяналіст.**

**Гвардыі лейтэнант Малагін».**

13 лістапада 1983 года ў саставе баявой групы Юрый Кузняцоў знаходзіўся ў засадзе. Вечарам з'явілася банда мяцежнікаў. Завязаўся цяжкі бой – не на жыццё, а на смерць.

Кулямётчык Юрый Кузняцоў вёў агонь з укрыцця, не адзін душман лёг пад яго трапнымі чэргамі. Праціўнік абстрэльваў савецкіх воінаў з супрацьтанкавых гранатамётаў. Адна з гранат разарвалася паблізу пазіцыі, якую займаў Юрый. Ён быў смяртэльна паранены...

Да болю крыўдна абарвалася жыццё дзевятнаццацігадовага хлопца. Хутка шэсць гадоў, як загінуў сын, а маці амаль кожны дзень ідзе на яго магілку ў Старыя Лаўкі. Пасядзіць, пагутарыць, усцешыцца хоць тым, што яе Юра пахаваны дома.

**У памяці землякоў Юрый Кузняцоў застаўся маладым і прыгожым юнаком. За тое, каб насіць яго імя, змагаюцца піянерскія атрады, збіраюць аб ім матэрыялы. Няхай вечна жыве памяць аб мужным воіне-інтэрнацыяналісту.**

**М. МАЦІЕЎСКІ**